**24.** У якіх складаных словах пішацца злучальная галосная ***я***? Выберыце правільныя прыклады:

*1) вол..выяўленне; 2) пуц..водны; 3) вугл..здабыча;*
*4) вугл..носны; 5) зерн..сушылка.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**25.** Які назоўнік прапушчаны ў вершаваным радку з паэмы Канстанціна Вераніцына “Тарас на Парнасе”?

*Хадзіў ці доўга ён, ці мала, ды толькі нешта адзін раз … у бары яго спаткала.*

**А)** пані. **Б)** непрыемнасць. **В)** прыгода. **Г)** бяда. **Д)** нечаканасць.

**26.** Выберыце дзеясловы, якія ў форме 1-ай асобы множнага ліку будучага часу закончанага трывання маюць канчатак ***-ем(-ём)***:

*1) веяць; 2) ехаць; 3) злаваць; 4) радавацца.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**27.** Вучні запісвалі словазлучэнні: Васіль – *за сем кіламетраў ад горада;* Ігнат – *выбачайце мяне;* Дзям’ян – *клопат аб дзецях;* Сымон – *загадчык магазінам.* Хто з вучняў правільна выканаў заданне?

**А)** усе вучні. **Б)** няма правільных адказаў. **В)** Васіль, Дзям’ян.
**Г)** Ігнат, Дзям’ян, Сымон. **Д)** Дзям’ян, Сымон.

**28.** Вызначце сказ, у якім дапушчана пунктуацыйная памылка:

*1) Рамантык, чалавек адкрытай душы, ён з маленства прывык верыць людзям.*
*2) Сярод статка кароў важна паходжваў на высокіх нагах, гаспадар палёў і балот, бусел.*
*3) Толькі звінеў малады дзявочы смех, радасны і прываблівы.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** усе сказы запісаны правільна. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**29.** *Прадмет верхняга адзення* ў народзе здаўна называюць … .

*1) апранаха; 2) апоркі; 3) апона.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**30.** Хто з беларускіх паэтаў з’яўляецца аўтарам слоў: *“Абломкі крыўдных слоў сядзяць у душы, як стрэмкі…”*?

**А)** Ніна Мацяш. **Б)** Максім Танк. **В)** Пімен Панчанка.
**Г)** Уладзімір Караткевіч. **Д)** Васіль Зуёнак.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 17. Тыраж 12000 экз. г. Мінск. 2013 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2013»

*Чацвер, 21 лютага 2013 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 10-11 класаў

**1.** Якое слова прапушчана ў вершаванай пацешцы Васіля Віткі “Благата”?

*Добраму чалавечку*
*Добра і ў запечку,*
*А благой благаце*
*Не ўнаровіш … .*

**А)** у хаце. **Б)** нідзе. **В)** на куце. **Г)** на скаварадзе. **Д)** на стале.

**2.** Вызначце з дадзеных “лішні” назоўнік:

*1) няўмека; 2) непаседа; 3) прыгажун; 4) малайчына.*

**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**3.** Колькі прыслоўяў ужыта ў вершаванай загадцы Міхася Пазнякова?

*Не спіць удзень,*
*Працуе ўночы.*
*То свішча моцна,*
*То шапоча.*

*Адчыніць фортку,*
*Хмары згоніць,*
*Улетку*
*Водарам спалоніць.*

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**4.** Якія сінонімы можна падабраць да ўстойлівага выраза *дзень пры дні*?

*1) часта; 2) рэдка; 3) штодзень; 4) неўзабаве; 5) уважліва.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 4, 5.

**5.** Выберыце з дадзеных правільна запісаныя словы:

*1) Алла; 2) Інна; 3) Нонна; 4) Геннадзь; 5) Ганна; 6) Жанна.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 5, 6.

**6.** Якім членам сказа з’уляюцца выдзеленыя ў сказах словы?

*1)* ***Ціха*** *ноччу ў лесе. 2) Зімой* ***марозна*** *ўсюды.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем. **Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

**7.** У якіх словах з прыведзеных на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***ў***?

*1) сея..ка; 2) мо..чкі; 3) хлопцы-..мельцы; 4) гучнае “..ра”; 5) ла..сан.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 1. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3, 4. **Д)** 4, 5.

**8.** Аўтарам верша “Явар і каліна” з’яўляецца … .

**А)** Францішак Багушэвіч. **Б)** Кастусь Каліноўскі. **В)** Паўлюк Трус. **Г)** Янка Купала. **Д)** Якуб Колас.

**9.** У якіх словазлучэннях назоўнікі маюць канчатак ***-а***?

*1) бочка з дуб..; 2) у парку пачатак лістапад..;*
*3) сукенка з атлас..; 4) да варот не было пад’езд.. .*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**10.** Адпаведнікам устойлівага выраза з рускай мовы *ни слуху ни духу* з’яўляецца ў беларускай мове … .

**А)** ні свярбіць ні баліць. **Б)** без нічога ніякага. **В)** якая птушка, такія і песні. **Г)** як прыйшлі, так і размінуліся. **Д)** і куры не шэпчуць.

**11.** Вызначце від сказа: *Рэшатам вады не наносіш.*

**А)** назыўны. **Б)** пэўна-асабовы. **В)** няпэўна-асабовы. **Г)** абагульнена-асабовы. **Д)** безасабовы.

**12.** Лічэбнік *паўтараста* – … .

**А)** колькасны састаўны. **Б)** колькасны зборны. **В)** колькасны дробавы. **Г)** парадкавы састаўны. **Д)** парадкавы складаны.

**13.** Які сказ з дадзеных запісаны правільна?

**А)** Не гукай ты шэрая зязюля шумным гукам у бары.
**Б)** Не гукай, ты шэрая зязюля шумным гукам у бары.
**В)** Не гукай, ты шэрая зязюля, шумным гукам у бары.
**Г)** Не гукай ты, шэрая зязюля шумным гукам у бары.
**Д)** Не гукай ты, шэрая зязюля, шумным гукам у бары.

**14.** *Вялікая скрынка з векам, якая ў даўніну служыла для захоўвання адзення, тканіны, каштоўнасцей,* называецца … .

**А)** саквояж. **Б)** кубел. **В)** куфар. **Г)** чамадан. **Д)** шкаф.

**15.** Выберыце з прапанаваных прыслоўі, якія напісаны правільна:

*1) перш-наперш; 2) давеку; 3) запанібрата; 4) нізавошта; 5) утраіх.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**16.** Дапоўніце народнае выслоўе: *Добры пачатак – … .*

**А)** добрае і насенне. **Б)** дрэнна і на куце. **В)** так і яны табе. **Г)** не без добрых людзей. **Д)** палавіна справы.

**17.** Дадзены назоўнікі:

*1) глыб; 2) весялосць; 3) гусь; 4) медзь; 5) ветлівасць; 6) косць.*

У якіх словах у форме творнага склону адбываецца падаўжэнне апошняй зычнай асновы?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 3, 4. **Д)** 5, 6.

**18.** У якіх сказах з прыведзеных няправільна ўжыты дзеепрыслоўі?

*1) Вецер, прасушваючы выбітыя каляіны на дарозе, шалясцеў леташнім быльнягом. 2) Халоднае паветра ўрывалася ў пакой, прынёсшы з сабой непаўторныя пахі вясны. 3) Дождж ліў як з вядра, і, падыходзячы да хаты, на мне не было сухой ніткі.4) Янку, уткнуўшыся тварам ў падушку, прысніўся страшны сон.*

**А)** усе сказы запісаны правільна. **Б)** ва ўсіх сказах, акрамя 1. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**19.** З якімі словамі з дадзеных часціца ***ні*** пішацца разам?

*1) (ні) колькі; 2) (ні) часу, (ні) сіл; 3) (ні)кім;*
*4) (ні) свет (ні) зара; 5) (ні)адзін з нас.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**20.** *Дэкаратыўная кустовая расліна з блакітна-ліловымі або белымі пахучымі кветкамі, якія ўтвараюць вялікія суквецці,* называецца … .

**А)** агрэст. **Б)** бэз. **В)** рабіна. **Г)** язмін. **Д)** ядловец.

**21.** Вызначце з прапанаваных словазлучэнне, у якім падкрэсленае слова ўжыта правільна: *1)* <u>*адзінокі*</u> *выстрал; 2)* <u>*пясчаны*</u> *колер; 3)* <u>*дробязны*</u> *твар; 4)* <u>*каларыйная*</u> *ежа.*

**А)** усе прыклады. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**22.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***і***?

*1) м..тусня; 2) м..жсезонны; 3) верм..шэль; 4) с..рата; 5) в..рнісаж.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 5. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**23.** Вучні выпісвалі з тэксту словы, будова якіх павінна была адпавядаць схеме “прыстаўка+корань+суфікс+канчатак”:

*1) абыякавы; 2) забудова; 3) наглядчык.*

Якія прыклады выпісаны правільна?

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.